[...]АРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 196 (1163) ‖ ПАНЯДЗЕЛАК, 25-га жніўня 1930 г. ‖ ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

УСІМ ОРГАНІЗАЦЫЯМ ЛКСМБ
ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ СКЛІКАЕМЫ НА 28 ЖНІЎНЯ 1930 ГОДУ ПЕРАНОСІЦЦА.

Аб дню скліканьня будзе паведамлена асобна.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

Колгасна-вытворчы паход комсамолу

ВЯЛІКІ ПОЛІТЫЧНЫ ЭКЗАМЕН!

Колгасна-вытворчым паходам комсамолу прадэманструем свае сілы ў змаганьні на ўсіх вучастках фронту барацьбы за соцыялістычную перабудову вёскі

НАНЕСЕМ РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАЦТВУ І ЯГО АГЕНТАХ У ШЭРАГАХ ПАРТЫІ І КОМСАМОЛЕ—ОПОРТУНІСТЫХ І ІХ ПАМОЦНІКАХ—„ЛЕВЫХ“ ЗАГІБШЧЫКАХ

Накіруем ініцыятыву і энтузіязм арміі комсамолу і працоўнай моладзі на вырашэньне задач умацаваньня колгасаў і далейшага ўпартага ажыцьцяўленьня суцэльнай колектывізацыі і на базе яе ліквідацыі кулацтва як клясы

Практычныя мерапрыемствы колгасна-вытворчага паходу

Колгасна-вытворчы паход ленінскага комсамолу зьяўляецца важнейшым гаспадарча-палітычным мерапрыемствам, зьмест якога павінен быць накіраваны на практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б), у справе карэннай перабудовы сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад. Ён павінен забясьпечыць мобілізацыю ўсіх сіл колгасных і асноўных адзінаасобных мас сялянства на пасьпяховае вырашэньне задач асеньняй пасеўнай кампаніі і стаць рашаючым заключным зьвяном работы комсамолу на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва вёскі да пачатку 3-га году пяцігодкі.

Разгорнутым масавым колгасна-вытворчым паходам, які павінен ператварыцца ў магутную баявую дэмонстрацыю ўсіх сіл, што змагаюцца за соцыялістычную перабудову вёскі, комсамол павінен пад кіраўніцтвам партыі нанесьці новы руйнуючы удар кулацтву і яго агентуры-правым опортуністам.

Ён павінен паказаць наколькі комсамольскія організацыі вёскі, камітэты і ячэйкі сапраўды павярнуліся тварам да вытворчасьці і наколькі змаглі перабудавацца ў новых умовах, быць сапраўды правадырамі мас савгаснай і колгаснай батрацка-бядняцкай і серадняцкай адзінаасобнай моладзі.

Выходзячы з задач, пастаўленых ЦК Усе ЛКСМ і ўмоў Беларусі, якія заключаюцца па-першае, у тым, што у Беларусі колектывізавана ўсяго толькі 15 проц., і галоўным чынам—у асеньня-пасеўную кампанію, гэта яшчэ больш падвышае нашу адказнасьць за ўмацаваньне і лепшую організацыю працы ў колгасах і далейшае аб'яднаньне адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы; і, па-другое,—Беларусь прызвана быць ударнай на фронце вырашэньня мясной проблемы праз разьвіцьцё сьвінагадоўлі.

ЦК ЛКСМБ лічыць, што асноўная ўвага колгасна-вытворчага паходу павінна быць зьвернута на шпарчэйшае выкананьне пастаўленых задач у галіне жывёлагадоўлі, галоўным чынам сьвінагадоўлі, шляхам замацаваньня і лепшай організацыі працы існуючых колгасаў і савгасаў і далейшай працы па аб'яднаньню адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы.

I. У мэтах умацаваньня існуючых колгасаў, організацыі новых і павялічэньня ўдзельнай вагі ячэек ЛКСМБ у вырашэньні гаспадарча-палітычных задач ЦК ЛКСМБ прапануе прарабіць наступнае:

а) У час колгасна-вытворчага паходу на працягу верасьня і кастрычніка месяцаў правесьці масавы агляд організацыі працы ў колгасах па ўсёй організацыі Беларусі, пад лёзунгам: „Да біцца ўдарных тэмпаў працы і падвышэньня яе якасьці“, які адначасова з выяўленьнем становішча працы павінен замацаваць організуючую ролю ячэйкі ў працы колгасу і савгасу. Асноўнымі пытаньнямі агляду і замацаваньня працы ячэек ЛКСМБ павінны быць: сталае вывучэньне організацыі і аплаты працы ў колгасах і популярызацыя лепшых яе прыкладаў, барацьба за складаньне сустрэчнага вытворчага пляну працы і за яго поўнае выкананьне, складаньне ўдарных брыгад па асобных галінах працы і іх правільнае і рацыянальнае скарыстаньне, наладжваньне працы вытворчых нарад і барацьба за сваячасовае выкананьне прапаноў, уключыўшыся ў Усесаюзны паход па збору прапаноў, удзел у правільным правядзеньні дырэктывы партыі па размеркаваньню ўраджаю.

б) дабіцца сваячасовага заканчэньня ўборкі ўраджаю, сваячасовай абмалоткі і правядзеньня асеньняга севу, пашырэньня пасеўнай плошчы і правядзеньня шэрагу мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці, організуючы для гэтага дапамогу з боку колгасаў адзіналічным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, што яшчэ болей умацуе сувязь паміж колгасамі і савгасамі і адзіналічнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. У гэтых пытаньнях яч. ЛКСМБ павінны выявіць найвялікшую ініцыятыву;

в) правесьці справаздачныя сходы аб дасягнутых посьпехах колгасаў і савгасаў перад адзінаасобнымі бядняцка серадняцкім масамі. Гэткія сходы павінны правесьці савгасныя і колгасныя комсамольскія яч. сярод адзінаасобнай бядняцка-серадняцкай моладзі. Правядзеньне гэтага мерапрыемства дасьць магчымасьць яшчэ больш зблізіць савгасы і колгасы з адзінаасобнымі бядняцка-серадняцкімі масамі, на падставе популярызацыі іх працы і ўцягненьня новых адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы.

г) Правесьці карэнную перабудову масавай політвыхаваўчай працы, прыстасаваўшы яе да задач абслугоўваньня колгасаў, праводзячы ў час колгасна-вытворчага паходу агляд культурна-выхаваўчых організацый, якія абслугоўваюць колгасы. Асноўнымі задачамі агляду павінны зьявіцца: набліжэньне культурна-асьветных устаноў (хат-чытальняў, клюбаў, кутко̆ў) да колгасаў і савгасаў, прыстасаваньне зьместу масавай іх працы да штодзённага жыцьця колгасаў і савгасаў. Забясьпечаньне культасьветных устаноў кадрамі.

II. Дабіцца найхутчэйшага выкананьня дырэктыў па сьвінаводчаму паходу і заданьняў па сілосаваньню. Акрамя гэтага, улічваючы, што вялікім тормазам у будаўніцтве сьвінарнікаў зьяўляецца недахоп рабочай сілы, абвясьціць усіх комсамольцаў, якія заняты на будаўніцтве сьвінарнікаў, мобілізаванымі да канца будаўніцтва і, у дадатак да гэтага, правесьці мобілізацыю яшчэ 750 чал. комсамольцаў для найхутчэйшага яго заканчэньня, асабліва ў сьвінаводчых савгасах.

а) У мэтах большай мобілізацыі ўвагі грамадзкасьці вакол пытаньняў сьвінаводзтва і сілосаваньня і наданьня гэтай рабоце ўдарных тэмпаў,—організаваць сьвінаводчы рапарт-эстафэту імя 9-га зьезду УсеЛКСМ, прыстасаваўшы яго да 10-га зьезду ЛКСМБ.

III. Піонэрорганізацыі і школы павінны дапамагчы ў наступным:

а) распрацаваць мерапрыемствы па колгасна-вытворчаму паходу на сваіх сходах і організаваць конкрэтную дапамогу КСМ у яго правядзеньні;

б) правільна організаваць працу падлеткаў у колгасах і савгасах;

в) змагацца за шчыльную сувязь школы з вытворчай працай савгасу і колгасу;

г) пасылаць брыгады піонэраў для дапамогі савгасным і колгасным атрадам у іх практычнай рабоце.

IV. За час колгасна-вытворчага паходу павінны быць організаваны пры кожным колгасе курсы па падрыхтоўцы кадраў з комсамольцаў, савгаснай і колгаснай моладзі па асобных галінах вядзеньня гаспадаркі (сьвінаводы, паляводы, жывёлаводы, манцёры с.-г. машын і інш.).

V. ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе гарадзкія і вытворчыя ячэйкі комсамолу прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні колгасна-вытворчага паходу, дзеля чаго неабходна:

а) пасылаць брыгады з лепшых комсамольцаў-ударнікаў для дапамогі савгасам і колгасам і перадачы лепшых прыкладаў з вопыту вытворчай працы, прыкладна ў такіх пытаньнях: праца вытворчых нарад, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, становішча працоўнай дысцыпліны, організацыя сустрэчнага промфінпляну і ўсесаюзнага збору прапаноў.

б) організаваць абменныя рапарты паміж вытворчымі падшэфнымі колгаснымі і савгаснымі ячэйкамі ЛКСМБ аб удзеле ў колгасна-вытворчым паходзе і аб працы на вытворчасьці, а таксама ў колгасах і савгасах;

в) організаваць сыстэматычную дапамогу па ўборцы ўраджаю і будаўніцтву сьвінарнікаў і сілосных ям шляхам пасылкі рабочых брыгад, скарыстоўваючы для гэтага выхадныя дні;

г) для організацыі дапамогі ў паходзе пры кожнай ячэйцы організаваць штабы садзейнічаньня паходу з уцягненьнем у іх усіх грамадзкіх організацый заводаў і фабрык.

VI. Для конкрэтнай дапамогі колгасна-вытворчаму паходу паслаць 15 чал. цэнтральнага актыву непасрэдна ў ячэйкі, тэрмінам на 1 месяц. Актыў павінен організаваць прыкладную працу і зрабіць вытворчы агляд працы па пытаньням яе організацыі, падрыхтоўкі да правядзеньня асеньня-пасеўнай кампаніі і выкананьня дырэктыў па жывёлагадоўлі.

VII. Правесьці зьлёты груп „ЛК“ для распрацоўкі задач колгасна-вытворчага паходу і організаваць налёты па праверцы выкананьня дырэктыў адпаведнымі організацыямі па яго правядзеньню.

VIII. Для кіраўніцтва паходам пры ЦК ЛКСМБ і райкомах утварыць штабы кіраўніцтва паходам з прадстаўнікоў камітэтаў ЛКСМБ (ён-жа старшыня), земаддзелаў, колгассаюзаў, малжывёлсаюзаў, профсаюзаў, мясцовых газэт і прадстаўнікоў камітэтаў КП(б)Б

IX. Прапанаваць усім ячэйкам і райкомам сыстэматычна, праз кожныя 10 дзён, інформаваць праз друк як „Чырвоную Зьмену“, так і мясцовых газэт аб ходзе працы па колгасна-вытворчаму паходу.

ЦК ЛКСМБ

Комсамол Украіны прыняў выклік

ХАРКАЎ, 22.—ЦК ЛКСМУ прыняў выклік Паўночна-Каўказскага Крайкому комсамолу аб організацыі хлебнай эстафеты імя 9-га зьезду УсеЛКСМ.

Комсамол Украіны дае абавязацельствы нарыхтаваць 24 мільёны цэнтнераў хлеба.

Масавыя арышты па ўсёй Польшчы

ВАРШАВА, 22. У сувязі з арыштам дэпутата Беларускай рабоча-сялянскай фракцыі сойму Дворчаніна, які абвінавачваўся ў тым, што ён быццам-бы ў часе дэманстрацыі ў вёсцы Алекшыцы (Гродненскага павету) страляў у паліцыю, арыштаваны 30 сялян за ўдзел у гэтай дэмонстрацыі.

Па ўсёй краіне ўтвораны вобыскі і масавыя арышты. У Варшаве ўтвораны поўны разгром левых рэволюцыйных організацый. Арыштавана 120 чалавек—з іх 60 чалавек вызвалены, астатнія адданы пад суд.

Провакацыя праваліласа

ПРАГА, 20.—Усе патугі прадпрыемцаў і паліцыі стварыць гучны пропэс супроць комуністых і членаў рэволюцыйных профсаюзаў у Пшэрове (Чэха-Славакія), арыштаваных нядаўна па абвінавачваньні ў замаху на ўзрыў прадпрыемства, скончыліся паўнейшым правалам.

Сьледзтва і вобыскі ня далі вялікіх вынікаў. Арыштаваных рабочых прышлося вызваліць.

Вынаходлівы Вірт

Габінэт Брунінга зацьвердзіў проэкт вынаходніцкай рэформы, выпрацаванай міністрам унутраных спраў Віртам.



Індыя

Крывавая сутычка насельніцтва з паліцыяй

Звыш 100 чалавек паранена

ЛЁНДАН, 22.—У Ахмэдабадзе адбылася вялікая сутычка мясцовага насельніцтва з паліцыяй. Вучаніцы мясцовай жаночай школы імкнуліся падняць нацыянальны сьцяг, забаронены англічанамі. Паліцэйскія пачалі супроцьдзейнічаць. Сабраўся вялікі натоўп індыйцаў, які імкнуўся прагнаць паліцэйскіх. Паліцэйскія пусьцілі ў ход бамбукавыя палкі.

Звыш 100 чалавек паранена. Арыштавана 20 юнакоў і 9 дзяўчат.

50.000 рабочых выкінуты на вуліцу

ЛЁНДАН, 23. Як паведамляюць з Бамбэю (Індыя), там у выніку байкоту зачынілася 19 ангельскіх тэкстыльных фабрык, на якіх было занята каля 50.000 рабочых.

Сяляне цэлымі акругамі спыняюць выплату падаткаў

Мільёны сялянства кінуты на голад

СТАМБУЛ, 23.—Як паведамляюць з Індыі, за няўплату зямельнага падатку у Пенджабе арыштавана каля 100 сялян.

Сяляне цэлымі акругамі спыняюць выплату ўрадавых падаткаў.

У вёскі пасланы моцныя паліцэйскія сілы. Зборшчыкі падаткаў адмаўляюцца ад службы.

Па словах „Ліберці“ 40 мільёнаў сялян маюць магчымасьць есьці толькі адзін раз у дзень і 70 мільёнаў ня могуць задаволіць свайго голаду нават адзін раз у год.

Пролетары Нямеччыны рыхтуюцца да баявых выступленьняў

10-га верасьня ва ўсёй Нямеччыне масавыя дэмонстрацыі і выступленьні беспрацоўных

БЭРЛІН, 23. Рэволюцыйная профопозыцыя пад кіраўніцтвам нямецкай компартыі організуе 10-га верасьня ва ўсёй Нямеччыне масавыя дэмонстрацыі і выступленьні беспрацоўных.

Усе гэтыя дэмонстрацыі павінны зьявіцца выказам брацкай і баявой солідарнасьці беспрацоўных і занятых рабочых. Выступленьні беспрацоўных адбудуцца на падставе распрацаванай програмы.

У сувязі з надыходзячым днём барацьбы з беспрацоўем цэнтральны орган нямецкай компартыі „Ротэ Фанэ“ зьмясьціў перадавы артыкул, у якім указвае, што тры мільёны беспрацоўных зьяўляюцца ахвярай пляну Юнга і капіталістычнай рацыяналізацыі.

З наступленьнем зімы колькасьць беспрацоўных значна павялічыцца. Між тым лідэры соцыял-дэмократаў і буйнага капіталу значна зьнізілі размер дапамогі беспрацоўным. Многія беспрацоўныя не атрымоўваюць ніякай дапамогі.

Газэта заклікае рабочых і беспрацоўных мобілізаваць усе сілы для таго, каб дзень 10-га верасьня ператварыць у падрыхтоўку перамогі компартыі на выбарах у рэйхстаг 14-га верасьня.

НАЛЁТ НА МЦРК БРЫГАД ГАЗЭ

Опортуністычнае кіраўніцтва МЦРК патрэбна зьняць!

Брыгады „Чырвонай Зьмены" і „Савецкай Беларусі" ўскрылі ў апараце МЦРК злачынныя факты опортуністычнай павольнасьці, безгаспадарнасьці, непаваротлівасьці і простага шкодніцтва ў кіраўніцтве рабочым забесьпячэньнем

Матар'ялаў і фактаў дастаткова для таго, каб зрабіць пэўныя політычныя і організацыйныя вывады

СЛОВА ЗА ПРОКУРАТУРАЙ І ЦКК--НК РСІ!

За шыльдай опортуністычнага благапалучча

„Чырвоная Зьмена" і шэраг іншых газэт на працягу доўгага часу шматлікімі артыкуламі паказвалі цэлую нізку асобных фактаў дрэннаў пастаноўкі рабочага забясьпечаньня.

У свой час падаваліся сыгналы аб тым, што не гатовы памяшканьні пад гародніну, што няма плянаў, а калі і ёсьць, дык дзесьці ляжаць пад сукном, што грамадзкая думка навакол гэтай важнейшай справы ня ўзьнята.

Сыгналы трубілі аб тым, што апарат МЦРК у гэтым пытаньні асабліва не сьпяшаецца, спадзяючыся на самацёк. „Об'ектыўныя прычыны" былі той сьцяной, за якую апаратчыкі з МЦРК стараліся захаваць сваю бязьдзейнасьць ад „надаедлівых" рабочых брыгад, „лёгкай кавалерыі" і карэспондэнтаў газэт.

У апараце нібы панавала змова аб благапалуччы.

Цэрабкопаўскае благапалучча ў самы разгар забясьпечаньня гораду продуктамі надзвычайна балюча ўдарыла па рабочаму спажыўцу. Перабоі з забесьпячэньнем бульбай, гуркамі, садавінай і іншай гароднінай, недабраякаснасьць—гніль гародніны, якімі крамы кармілі спажыўца,—выклікалі хваляваньні сярод рабочай грамадзкасьці.

Стала зусім зразумела, што тут справа ня столькі ў «об'ектыўных», колькі ў суб'ектыўных прычынах.

На працягу некалькіх дзён брыгады рабкораў газэт „Чырвоная Зьмена" і „Савецкая Беларусь" з удзелам атрадаў „лёгкай кавалерыі" сыстэматычна праводзілі налёты на апарат МЦРК, продуктовыя базы і магазыны.

Брыгады ставілі сабе мэтай знайсьці сапраўдныя перашкоды, з прычыны якіх на працягу апошніх тыдняў Менск забясьпечваецца гароднінай і садавінай з вялікімі перабоямі.

Матар'ялы брыгад, якія ў апошнія дні зьмяшчаліся на старонках газэт «Чырвоная Зьмена» і „Савецкая Беларусь", яскрава сьведчаць аб тым, што перашкоды ў асноўным высьветлены.

Магічнае дзеяньне цэрабкопаўскіх «об'ектыўных» прычын разьбіта дашчэнту.

Усе матар'ялы брыгад няэьлічонаю колькасьцю фактаў красамоўна расказваюць аб абураючых фактах безгаспадарнасьці, галавацяпства і шкодніцтва.

На падставе нашых матар'ялаў некаторыя шкоднікі пасаджаны ўжо на лаву падсудных.

Зараз стала ясна, што да апарату МЦРК прысасаўся не адзін і ня тры шкоднікі.

Сурыючай глебай, якая об'ектыўна служыла шыльдай для прыкрыцьця шкодніцкай дзейнасьці зьяўлялася расхлябанасьць, нерастараджальнасьць і політычная тупасьць кіраўніцтва МЦРК.

Чым, як ня горшым відам опортунізму можна назваць той факт, што пляны забясьпечаньня рабочых гароднінай і іншымі продуктамі складаліся цэрабкопаўскімі „спэцамі" са значна меншымі лічбамі адносна сапраўднай патрэбнасьці.

Выходзіла так, што цэнтрасаюз дае адны пляны, а МЦРК лічучы, што іх немагчыма выканаць за недастачай патрэбных продуктаў харчаваньня на мясцох, значна зьмяншаў. Гэта з аднаго боку, а з другога боку выстаўлялася прычына, што як быццам гародніны хопіць.

Опортуністычныя вушы кіраўнікоў паказваюцца з усёй непрыкрытасьцю, калі мець на ўвазе нормы, якімі зьбіраліся накарміць цэрабкопаўскія опортуністыя рабочага.

Мы заяўляем, што ўсе гэтыя прычыны ня маюць пад сабою зусім ніякіх падстаў.

Тыя матар'ялы, якія мы маем, сьцьвярджаюць, што гародніна ў саўгасах і колгасах ёсьць. Гэтага ня могуць ня прызнаць „спэцы" з Цэрабкопу, а гэта значыць, што і нормы, якія вызначаны ўрадам (180 кілёграм на чалавека бульбы, замест цэрабкопаўскіх 50 кілёграм) —выканаць было магчыма.

Шкодніцтва, безгаспадарнасьць, нерастараджальнасьць, галавацяпства, „очковтирательство", злачынства і політычная тупасьць—вось дзе галоўныя прычыны гэтага.

Чым, як ня шкодніцтвам назваць той факт, што продукты (капуста, гуркі, памідоры) валяючыся суткі ў вагонах, цэлымі тыднямі праляжвалі зваленыя ў кучы на складах пад адкрытым небам на чыгунцы.

Чым, як ня шкодніцтвам трэба назваць цэлыя дзесяткі фактаў, калі продукты, у прыватнасьці гародніна гніе на базах цэлымі тонамі, пасьля закопваецца, а магазыны яе ня бачаць.

Чым як не безгаспадарнасьцю, галавацяпствам трэба называць факты, калі на засолачным пункце дзесяткі тон гуркоў гнiюць лежачы пад адкрытым небам.

Матар'ялаў і фактаў, якія гавораць ня толькі аб безгаспадарнасьці, але і паказваюць яўнае шкодніцтва, злачынства—дастаткова, каб зрабіць пэўныя політычныя вывады.

Усё гэта магло мець месца ў такой меры ў апараце МЦРК толькі дзякуючы політычнай нячуласьці—тупасьці.

Забыўшы політычнае пачуцьцё, кіраўнікі МЦРК, хацелі яны гэтага, ці не, об'ектыўна патуралі шкодніцкім клясава-варожым дзеяньням, ня прымаючы ў кожным асобным выпадку рашучых захадаў да шкоднікаў і іншых злачынцаў — кіраўніцтва об'ектыўна ліло ваду на млын клясавага ворага.

Самакрытыка ў апараце МЦРК ня была той зброяй, астрыё якой накіроўвалася б на барацьбу з усялякімі шкодніцкімі праявамі.

І гэта адна з галоўнейшых прычыны таго, што злачынствы так доўга ня былі выкрыты. Толькі адсутнасьць сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі стварыла магчымасьці абрастаньня опортуністычнай твэньню цэрабкопаўскага кіраўніцтва.

Бесперапынныя і настойлівыя сыгналы „Чырвонай Зьмены" і „Савецкай Беларусі" парушыўшы супакой МЦРК —прымусілі праўленьне „заваліявацца".

23 жніўня быў склікаиы пленум МЦРК. Аднак, заблытаўшыся ў сецях опортунізму, пленум аказаўся няздольным па-бальшавіцку вырашыць пытаньне палепшаньня рабочага забясьпечаньня.

Замест жорсткай, бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі, якая-б ускрыла ўсе хібы, дала-б магчымасьць убачыць сапраўдныя прычыны перашкод у рабочым забясьпечаньні,—мы маем ня толькі салодкія прамовы аб казённым благапалуччы і „об'ектыўных прычынах", але і яўна опортуністычныя, паклёпніцкія заявы аб бульварщчыне і „перабаршчэньні друку".

Як матар'ялы, так і асабліва характар прамоў тыпу Хэўліна сьведчаць аб тым, што цяперашнія кіраўнікі ня здольны стаяць на чале кіраўніцтва МЦРК.

Матар'ялаў і фактаў дастаткова для таго, каб зрабіць пэўныя і політычныя і организацыйныя вывады.

Опортуністычнае кіраўніцтва МЦРК патрэбна зьняць.

Сыгналы для іх—лямант у пустэчы

„Чырвоная Зьмена" неаднакраць пісала аб недахопах і бясчынствах у справе рабочага забясьпечаньня. Але гэтыя сыгналы не дашлі да слуху коопэрацыйных заправіл. Для іх гэта быў толькі „лямант у пустэчы".

Толькі зараз, калі прокуратура, па матар'ялах брыгад „С. Б." і „Ч. З." прыцягнула да судовай адказнасьці некаторых працаўнікоў МЦРК, **праўленьне МЦРК „захвалявалася"**. Склікала пленум праўленьня.

Даклад тав. Хаўліна быў пабудаваны на тым, што ЦРК не вінаваты, вінаваты об'ектыўныя прычыны і тут „об'ектыўныя".

— МЦРК не данамаглі, усе валяць на МЦРК. Але добра яшчэ і тое, што сумесна з МЦРК прыцягваюць да судовай адказнасьці і інш. організацыі(?) Так гаварыў у сваім дакладзе тав. Хэўлін, але нічога конкрэтнага не сказаў аб мерах, якія трэба ўжыць, каб палепшыць рабочае забясьпечаньне. Наадварот, **Хэўлін** расказаў сабраўшымся аб бясплянавай плянавасьці забясьпечаньня, аб тым, што **МЦРК** скараціў пляны забясьпечаньня, даныя **Цэнтрасаюзам**. Так, напрыклад **Цэнтрасаюз** прапанаваў засаліць 5 **мільёнаў гуркоў, а МЦРК скараціў засолку да 3 мільёнаў.**

— Больш нельга! — запэўнівае тав. **Хэўлін**—Па-першае — тары няма, па-другое — гуркі дрэннай якасьці(?) **Цэнтрасаюз** даў заданьне заквасіць 2000 **тон капусты, а МЦРК спадзяецца заквасіць 1600 тон.**

Рабочы заводу **„Энэргія" тав. Хаскін** выступіў з рэзкай крытыкай работы апарату **МЦРК** Ён прывёў конкрэтныя факты забясьпечаньня рабочага спажыўца нядобраякаснымі продуктамі. Напрыклад.

У магазыне МЦРК № 15 сабралася вялікая чарга за гуркамі і памідорамі. Загадчык крамы на вачох усіх адчыняе скрыню з памідорамі, а там... гніль. Не памідоры, а каша.

МЦРК і не падумаў змагацца за якасьць, змагацца з галавацяпствам сваіх работнікаў. Хэўлін кажа: „Я, праўда, сам ня быў на Украіне, і не агроном, але мне гаварылі, што нядобраякаснасьць гуркоў залежыць ад нядобраякаснага насеньня(!)



Самакрытыка па-цэрабкопску

„Эх, самокритику я так люблю,
что рад-бы задушыць ее в своих об'ятьях"
БЯЗЫМЕНСКІ

Хэўлін у экстазе каханьня...

—Чакалі пакуль прыдзецца скласьці акт

Грыбы—прадукт, які хутка псуецца. Грыбы могуць палегчыць цяжкасьці ў рабочым забясьпечаньні. Але загатоўка грыбоў праходзіць бячынна. Так, напрыклад, загадчык базы пры станцыі **Менск-пасажырская** больш заняты складаньнем актаў, чым сваімі абавязкамі.

— Ня бывае дня—расказв[аў] ён—каб не атрымалі нядобр[а]якасны продукт. Па 10-15 больш скрынь папсаваных гр[ы]боў і агуркоў прыбывае шт[о] дня на базу.

За кароткі час закапалі 18 пудоў сапсаваных грыбоў

Рабочы з заводу **„Энэргія"** гэта з абурэньнем заяўляе:

— Чаму вы, Цэрабкоп, не ... валі пайнікам гэтыя грыбы, а ... калі пакуль яны сапсуюцца! Чак[а]лі пакуль прыдзецца скласьці ак[т]

Сучаснае становішча з бульбай вядома. План загатоўкі бульбы выканан на 45 проц. Замест ... тон бульбы, загатоўлена толькі ... **тон. А організацыі, якія па[вінны] ведаць кольк[і] загатоўле[на] і колькі не загатоўлена, ня ведаюць.** Акрамя таго няма ў патрэбнай колькасьці і ... мяшканьняў для хаваньня. Па Ме[н]ску ўлічаны ў **Жакт'ах** хавал[ьні]кі на 10 **тысяч тон**, але яны ... абсталяваны. Няма матар'ялаў, ... бочай сілы, нават... „няма салом[ы]". Рабочыя, відаць, ізноў ... дныі, застануцца бяз бу... бы (?)

Кожны прамоўца падкрэсьлі[ў], што гэтую справу прахлопалі, ... шляпілі, прамаргалі. Але ніхто ... сказаў аб конкрэтных носьбітах ...

Партыйныя, комсамольскія і пр[о]фэсыйныя організацыі маўчаць, ... гнуцца ў хвасьце, падтрымлі[ваюць] опортуністых разам з іх плянамі.

Іван ківае на Пятр[а], Пятрок ківае на Іва[на]

Узьнікае пытаньне:

— Дзе-ж корань ўсіх ... бясчынстваў?

Па нашаму, корань у тым, ... самакрытыка ў апараце МЦРК ... зьяўляецца штодзённай зброяй ... ганьня з опортуністычнай пра[кты]кай у рабоце апарату.

Пашыраная нарада праўле[ньня] МЦРК павінна была шляхам ... гортваньня бальшавіцкай сама[кры]тыкі выкрыць усе бясчынствы, ... дахопы і памылкі з тым, каб ... значыць пэўныя шляхі для ... джваньня работы.

Але гэтага ня здарылася. Усе [вы]ступаўшыя, як прадстаўнікі на[рых]тоўчых організацый, так і пр[ад]стаўнікі плянуючых організацый ... біліся аб... самакрытыцы.

Адна організацыя абвінавач[вала] другую:

— Ня мы, а ЦРК вінаваты — гаварылі загатоўцы.

— Ня мы, а загатоўцы віна[ваты] —гаварылі цэрабкопаўцы.

Лепшым прыкладам, які ад... роўвае становішча самакрыты[кі] адносіны да яе апарату, мож[а] ... жыць заключная прамова тав. Х[эў]ліна. Хэўлін бвінавацiў са[м]... друк у бульварнасьці за тое, ... ён голасна заяўляе аб... бясч[ын]ствах, якія творацца ў МЦРК, ... тое, што ён мобілізуе грамадзка[сьць] на барацьбу з гэтымі злачынст[вамі] і шкодніцтвам.

Мы лічым, што гэта праяў[а] не самага горшага, зьлейшага ... гляду опортунізму. Той факт, ... заява Хэўліна не спаткала ад... ад пашыранага пасяджэньня, ... ляецца лепшай характарыст[ыкай] становішча і разуменьня сам[акры]тыкі. Гэты факт зьяўляецца ... шым доказам таго, што кіраўні[цтва] МЦРК зацягнута твапьпю опорт[уні]зму.

Цішка Вер...

Праўленьне МЦРК „захваляваласяˮ...

Шыльда опортуністычнага благапалучча сарвана

Кіраўнікі, заблытаўшыся ў опортуністычным павуціньні, няздольны выканаць задач партыі аб рабочым забесьпячэньні

Тольні праз далейшае аздараўленьне апарату МЦРК за лік высоўваньня рабочых, арганізацыі штодзённага рабочага контролю, праз разгортваньне бязьлітаснай самакрытыкі, узяцьце фабрыкамі і заводамі Менску работы МЦРК на грамадзкі буксір, Цэрабкоп справіцца з сваімі задачамі

Факты абураючых зьдзекаў над рабочымі

Сталоўка № 20 гатуе 2000 абедаў у дзень, якімі абслугоўвае рабочых заводаў „Пролетары“, „Беларусь“, „Комунарка“ і пякарню МЦРК. Штат 46 чалавек. Парадку і адміністрацыйнага нагляду зусім няма. Глянуўшы на сьценку бярэ сумненьне: што гэта сталоўка, ці даўнейшая карчма? Рабочыя там сьнедаюць, абедаюць і вячэраюць. На сьнеданьне і вячэру гаворыць намесьнік загадчыка смажаць маласольную рыбу. Але калі мы запыталіся ў рабочых ці ядуць яны смажаную рыбу, дык яны адказалі, што ні разу яшчэ не каштавалі. Аказалася, што рыба хаваецца ў буфэце і плясьнее.

Нас зацікавілі пазьвязаныя пакуначкі рыбы па штук 20. Загадчык растлумачыў, што пакуначкі бяруць сабе супрацоўнікі—яны на гэта маюць права. Да абеду мы праверылі разьдзявалку супрацоўнікаў. Там сталі кошыкі. У кожным кошыку было па 10-15 абедаў. Высьнілася, што кожны супрацоўнік мае па 2 кошыкі.

Самога загадчыка ніколі ў сталоўцы ня знойдзеш, намесьнік яго які прысутнічаў пры выяўленьні „запасаў“, сказаў, што нічога дагэтуль аб гэтым ня ведаў.

На кухні—вялізная чарга з прыватных асоб, якая чакае на абед. Тут і дачка загадчыка. Яна ўзяла 8 абедаў. Кухар практыкант і некаторыя афіцыянткі заявілі, што яна цэлымі кошыкамі носіць рыбу са сталоўкі. На протэсты і заявы рабочых, якое права мае кухар выдаваць абеды прыватным асобам, той са злосьцю адказаў:—„Што хачу, тое і раблю—ня ваша справа“.

Мяса на кухні ляжыць адкрытым, на яго асядаюць хмары мух і разам з ім перапрацоўваюцца у машынцы на катлеты.

Сталоўка засаліла 5 бочак гуркоў, але есьці іх ніхто ня хоча. Ля брудамойнага карыта рэжуць хлеб. Брудная вада пырскае на хлеб. Рабочых частуюць зусім мокрым хлебам, ды і таго не хапае. Кухар сказаў, што прыходзіцца на чалавека—200 грам. Переважылі тры лустачкі хлеба—большую, сярэднюю і меншую, што рабочыя атрымоўваюць і аказалася—150, нават—120 грам. За талёнамі на абед рабочыя становяцца ў доўгую чаргу, а ў гэты час афіцыянткі без чаргі бяруць талёны з касы для сваіх знаёмых. Касіры, убачыўшы сваіх знаёмых выдаюць ім талёны, разьлічваюцца мабыць потым.

У кнізе скаргаў зусім няма адказаў. Рабочыя бачачы гэта пачалі пісаць скаргі колектыўна. Яны патрабавалі тры разы зьняць з працы загадчыка, намесьніка і старшага кухара, але адказаў і вынікаў няма.

Брыгадзір **Ліпскі.**

ДЗЕ ІХ НЯМА ГЭТЫХ АКТАЎ?

Брыгада ў складзе т. т. Шувалавай, Брудно і Рублёва абсьледвалі становішча складу буфэта і базы гародніны і садавіны. Вось што нашла брыгада:

Склад абслугоўвае 10 буфэтаў, 16-17 ларкоў і 12-14 крам-буфэтаў, да якіх прадпрыемствы прымацаваны. Штат складу 11 чал. Склад мае 5 фурманак для развозу прадуктаў па буфэтах. Продукты склад атрымлівае з базы МЦРК іх прывозяць без папярэдніх заказаў, ня ведаючы, колькі і якія продукты складу патрэбны. Прывозяць столькі, колькі ёсьць на базе, звычайна з недастачай (па некалькі разоў у дзень і прытым несваячасова). Работа на складзе вядзецца зусім бясплянава, няма ніякіх інструкцый аб нармаваньні продуктаў для асобных буфэтаў, адсутнічае ўсялякі вучот пры буфэтах і сьпіс асортымэнтаў тавараў для кожнай катэгорыі буфэтаў. Склад ня ведае, пры якой установе, ці прадпрыемстве знаходзіцца той ці іншы буфэт.

Водпуск тавараў робіцца такім чынам, што даводзіцца тут-жа разьлічвацца за тавар і за тару. Прынясячы тару назад (пару мяшкоў і скрынак) і ноў пачынаецца грашовы разьлік.

На складзе ляжаць псаваныя гуркі, яблыкі, тро у памідор і некалькі бочак павідла, якое таксама пачало псавацца.

Ужо са шкляных банак, прадраўшы паперу вылезла павідла наверх капцуром Каля дзьвярэй на двары валяецца два мяхі і скрынка гнілых гуркоў, якія чакаюць складаньня акт аб няпрыгоднасьці. Усё гэта стварае нэрвовую атмосфэру ў працаўнікоў складу.

Нэрвуе працаўнікоў і само праўленьне МЦРК якое зрывае раскладку зробленую складам на папяросы, масла, сыр і г. д., прыватнымі пісулькамі аб выдачы гэтых тавараў нейкім „прыяжджаючым“. Такіх пісулек, як кажа нам загадчыка складу кожны дзень бывае да 120.

Буфэты падзяляюцца на дзьве катэгорыі: буфэты рабочых і служачых. Першыя яшчэ падразьдзяляюцца на буфэты індустрыяльных рабочых і лёгкай прамысловасьці. Асортымэнт тавараў для буфэтаў служачых так: цукеркі, яблыкі, гуркі, і бобла. У буфэты рабочых выдаецца, апроч таго, сыр і каўбаса.

Прысланы мех гуркоў у буфэт Наркамгандлю, гніе на падлозе. Буфэтчыца не хацела прымаць гнілых гуркоў, але возчык іх скінуў і ўсё. Гуркі ляжаць тры дні і іх ніхто не бярэ. З іх пацёк ужо сок.

— Шырока распаўсюджаны акты на гніль. У буфэтах акты на складах акты, на базе акты... Дзе іх няма гэтых актаў! Нязьлічоная колькасьць продуктаў не трапляе да спажыўца, а гіне дашчэнту.

— Наша брыгада, дакладвае брыгадзір тав. Лапін,—абсьледавала сталоўку шчотачнай ф-кі імя Крупскай, якая абслугоўвае 710 чалавек. Пры сталоўцы ёсьць буфэт. ЦРК дае сталоўцы 35 кілё мяса штодня. Адміністрацыя і служачыя карыстаюцца сталоўкай нароўне з рабочымі. З прысланых 55 кілё гуркоў—35 літаральна гнілыя.

Абеды прывозяць з 19 сталоўкі, але са спазьненьнем,—пасьля перарыву. Возяць абеды па пылу, накрытыя газэтамі. Ад газэты увесь шрыфт адціскаецца на страву. Есьці абеды даводзіцца астыўшыя. На ўсю сталоўку ёсьць толькі 10 лыжак, місак таксама не хапае. Гарчыцы і іншых прысмакаў ня возіцца. Нажоў няма зусім. Хлеб трэба ламаць рукамі, мяса рваць лыжкай.

За лыжкамі чарга,—адзін есьць а за ім 5 чалавек чакаюць.

Ёсьць так званае спэцыяльнае харчаваньне на 114 рабочых шкоднага валасяна-шчот чнага цэху. Рабочым гэтага цэху даюць па паўлітра малака ў дзень. Але бываюць выпадкі, калі рабочыя не атрымліваюць малака. Гэта тлумачыцца тым, што загадчык гаспадаркі ня звезьдзіць за малаком.

Другая і трэцяя зьмены рабочых нічога не атрымліваюць, ніякіх абедаў і нічога з буфэту. Рабочые гэтых зьмен узьнімалі наконт гэтага пытаньне перад МЦРК. Той прыслаў на фабрыку свайго інструктара, а ён важна заявіў ад імя ЦРК.

„Не дазваляю нічога дадатковага“.

Аб прапаўшых вагонах і умт'аўскіх парадках

Наша брыгада была складзена з чатырох чалавек: Касьцюка, Лунгіна, Раткевіча і Гурэвіча. Нам было даручана абсьледаваць транспарт, высьветліць, як транспарт дастаўляе гародніну.

У УМТ'е нам сказалі, што у іх маецца 119 коняй, з іх у стойле павінна стаяць 23 каві—10 хворых і 14 выхадных. Калі-ж праверылі па куратнай ведамасьці, дык там зусім іншае: 99 коняй прапавала, 6 хворых і 8 выхадных. Такім чынам прапала 6 коняй нявядома дзе.

23 жніўня на стайні з 119 коняй стаяла 41 конь, але-ж па тлумачэньню загадчыка гаспадаркі 8 коняй пойдуць на другую зьмену. Такім чынам застаецца на стайні адпачываць 33 каві. Калі ўлічыць тое, што на дзесяты дзень конь выхадны, дык павінна было б быць толькі 12 выхадных коняй.

Праверкі і вучоту выхадных коняй няма. База заказала сёньня на 7-8 і 9 гадзін раніцы па 10 фурманак, а 7 гадзіне прыбыла 5 фурманак, а 8-ай—4. Значыць з 30 заказаных фурманак прыбыла толькі 9.

ЦРК з УМТ'ам ня мае дагавору. Затым УМТ у першую чаргу абслугоўвае тых, з кім заключаны дагаворы.

УМТ мае 10 аўтамашын, але палова з іх у рамонце. Да астатніх адносяцца безгаспадарна Адну з машын пусьцілі па бульбу у в. Сеніцу бяз ліхтароў. Яна зламалася.

Здараецца у УМТ'е так: падрыхтоўваюць машыну каму небудзь з сваіх заказчыкаў, а праўленьне транспартнага трэсту здымае машыну з работы і пасылае на выпадковую работу. Напрыклад, адвесьці каго-небудзь у Прылукі ці у Астрашыцкі Гарадок. Сам трэст уносіць бесгаспадарнасьць у рабоце.

Мы сустрэліся з агіднейшымі фактамі безгаспадарнасьці на чыгунцы. Знайшлі прапаўшы вагон, які стаяў 4 дні ў тупіку і ніхто ня ведаў дзе ён. У вагоне сапрэлі гуркі.

Альбо такі факт. З Асіпавіч пададзен поўнагрузны вагон, а ў ім аказалася толькі 37 мяшкоў гуркоў (120 пудоў ня больш). Гэты факт не адзінічны.

25-VIII г. г. у памяшканьні клюбу Леніна на пас. ст. Кастрычнікавы РК ЛКСМБ склікае сход камсамольцаў наступных колектываў і ячэек ЛКСМБ: МЦРК, Белсампрамсаюзу, Белкоопсаюзу, Колгасцэнтру, чыгункі, УМТ'у па пытаньню: „Рабочае забясьпечаньне і ўдзел КСМ“.

На сход павінен зьявіцца коопэрацыйны актыў раёну, а таксама запрашаецца і беспартыйная моладзь, якая працуе ў коопэрацыйных установах.

Сход адбудзецца роўна а 7 гадз. увеч.

„Хвост“ дык невялікі, а галавацяпства парадачнае

Нам давялося налятаць на мясныя і рыбныя магазыны МЦРК. Першы наш рэйд быў накіраваны на комсамольскі магазын № 6 па Гарбарнай вуліцы.

У ім маецца мясны аддзел, дзе працуе 2 чалавекі. Яны і загадчык магазыну даволі добра абмалявалі становішча, што быццам у іх усё добра. Толькі скардзіліся на тое, што згодна інструкцыі ЦРК усе магазыны павінны забясьпечвацца мясам 5 раз у месяц—праз кожныя 6 дзён—4, 11, 17, 23, 29. Але ў гэтым месяцы яны атрымалі толькі два разы, і то не па вызначаных лічбах МЦРК, а так-сабе,—наскокам. У выніку утвараюцца вялікія хвасты—чарга.

— Праўда, у нас, — гаворыць загадчык,—я знайшоў другі выхад: зусім не абвяшчаю насельніцтву раёну. А калі убачаць, што вязуць мяса, дык хай сабе і ўтвараюць чаргу. „Хвост“, як бачыце невялікі.

Тое што „хвост“ невялікі гэта ня дрэнна, але тое, што вялікая частка рабочего насельніцтва Ляхаўкі не атрымае мяса з-за „хітрыкаў“ загадчыка, гэта таксама факт.

Пратэкцыянізм праз „чорны ход“

Рабочы швэйнай ф-кі „Кастрычнік“ тав. Давідовіч расказаў нам аб цэлым шэрагу бясчыньнейшых адносін з боку асобных працаўнікоў магазыну. Выдалі запіску аднаму пайніку на атрыманьне кілё мяса без чаргі у той час, як іншыя засталіся бяз мяса.

Работнік Акрвыканкому зусім не прымацаваны да гэтага магазыну атрымлівае малако без чаргі і выходзіць заўсёды праз чорны ход.

Упаўнаважаны МЦРК тав. Бондараў, нявядома па якіх прычынах вырваў з кнігі скаргаў 2 лісты. Заўважваюцца таксама грубыя адносіны да пайнікаў (асабліва з боку прыказчыцы Шульман).

Загадчык магазыну ў мэтах ліквідацыі чаргі хлусіў пайнікам, што няма тавару, за якім яны стаяць у той час, калі гэты тавар (панчохі) быў.

„Прынцыпы“ помпадураў з крамы № 47

Па дарозе ў мясную краму № 47 мы сустрэліся з цікавым і ў той-жа час абураючым фактам. Было 11 гадзін дню, а хлебная крама № 133 была зачынена. Пайнікі нам паведамілі, што працаўнікі гэтай крамы, працуюць па „прынцыпу“: „чаго мая левая нага захоча“, зачыняюць крамы замест 11 гадзін у 9, а то і раней, на працу спазьняюцца і г. д. Ніякага контролю ў працы гэтай крамы з боку МЦРК няма.

Магазын разьмяркоўвае мяса паміж сталоўкамі, жактамі, дзіцячымі пляцоўкамі і іншымі грамадзкімі сталовымі. Мясам ён забясьпечваецца кожны дзень.

Першае, што кідаецца ў вочы у гэтым магазыну,—гэта адсутнасьць вучоту. 21-га жніўня з Менскай бойні было атрымана 514 кілё мяса, выдана-ж толькі 340. Куды-ж пайшлі астатнія 177 кілё па вучотнай кніжцы нічога нельга даведацца, а загадчык магазыну „добра не памятаў“ колькі ў яго засталося мяса 21-га жніўня.

„Такі загад МЦРК“

МЦРК ні разу не зацікавіўся становішчам гэтага магазыну. А загадчык нават ня мае ўяўленьня, як будуць рабіць рэвізыю?

У гэтым-жа магазыне зусім выпадкова мы сустрэліся з такім абураючым фактам галавацяпскіх адносін да працы з боку працаўнікоў складу № 4.

Тры разы накіроўвалася 1242 кілё бульбы ў мясную краму № 47 і тры разы адвозілася яна зноў на склад. А ў той час магазыны садавіны і гародніны сумна пуставалі.

На Віленскім рынку ёсьць балаганчык—гэта рыбны ларок. Там даюць пайнікам рыбу самых апошніх сартоў.

— Нічога ня зробіш—су аной-вае загадчык, такі загад МЦРК.

Быў факт, калі рыба ляжала на станцыі, ад 6-ці гадзін раніцы да 3-х дню.

А пайнікі сталі у чарзе.

Брыгада: **Сьляпян, Сяргеевіч, Сухман.**

Капусныя галовы, якія заражаны опортуністычным грыбком

М. Ц. Р. К.

Спажывец: Як шмат гнілых капусных галоў і.. як мала бульбы.

Хлебазагатоўкі—зьвяно колгасна-вытворчага паходу

Наступае рашучы пэрыяд хлебазагатовак

БЕЗАДКЛАДНА ВЫЖЫЦЬ НЯДБАЙНАСЬЦЬ І ЦЯГАНІНУ. ДАВЕСЬЦІ ПЛЯН ХЛЕБАЗАГАТОВАК ДА КОЖНАЙ ВЁСКІ І КУЛАЦКАЙ ГАСПАДАРКІ—ЗАДАЧА ДНЯ

Комсамол павінен мобілізаваць шырокую грамадзкасьць сельгаслесрабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкія масы на пасьпяховае правядзеньне хлебазагатовак

ЗАДАНЬНЕ АБ ЗАГАТОЎЦЫ 123 ТЫСЯЧ ТОН ХЛЕБА ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА

Хлебазагатоўкі—важнейшая задача дня

Першыя весткі аб правядзеньні хлебазагатовак гавораць аб тым, што многія організацыі, у тым ліку і комсамольскія, недастаткова энэргічна ўзяліся за гэтую важнейшую справу. Таму не выпадкова, што ліпеньскі плян хлебазагатовак у шмат якіх мясцох далёка ня выкананы. Гэтыя факты сьведчаць аб наяўнасьці яшчэ большай непаваротнасьці, абломаўшчыны, неорганізаванасьці ў хлебазагатоўках.

Неабходна баявая мобілізацыя ўсіх сіл на вёсцы на загатоўку хлеба, на барацьбу з кулаком, які імкнецца сарваць хлебазагатоўкі.

Комсамол, дапамагаючы партыі, павінен згрупаваць вакол сябе перадавы актыў вёскі, бядняцка-серадняцкую моладзь, колгасьнікаў, дэлегатак і разгарнуць агітацыйную культурна-масавую работу ў хатах-чытальнях, на ссыпных пунктах, у чырвоных кутках.

У кампанію хлебазагатовак неабходна ўвесьці комуністычныя мэтады работы: ударніцтва і соцыялістычнае спаборніцтва, узяўшы за асноўныя паказальнікі сваячасовую прыёмку і адгрузку хлеба, проста з-пад малацілак на ссыпныя пункты. Ніводнага фунта прыватніку! Організацыя чырвоных абозаў!

Дапамога загатоўчым організацыям павінна заключацца ў праверцы выкананьня контрактацыйных абавязацельстваў як пасеўшчыкам, так і організацыям, законтрактаваўшым пасевы. Комсомол абавязан прыняць актыўнейшы ўдзел у рабоце камісіі садзейнічаньня ў забясьпечаньні загатоўчых організацый тарай, у рамонце памяшканьняў для ссыпных пунктаў, на ўкомплектаваньні гэтых організацый неабходнымі кадрамі.

Асаблівую ўвагу комсамольскія ячэйкі павінны ўдзяліць устанаўленьню сувязі з гарадзкімі ячэйкамі, каб забясьпечыць опэрацыйную работу, наладзіць перавозку хлеба з ссыпных пунктаў ў элеватары, організаваць масавую агітацыйную работу ў час кампаніі.

Комсамол павінен даць хлебазагатоўчай кампаніі свае лепшыя сілы, баявыя ўдарныя брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай бядняцка-серадняцкай моладзі.

Комсамольскія організацыі павінны падхапіць першы пачын Паўночна-Каўказкага комсамолу па хлебазагатоўчай кампаніі — абвешчаную крайкомам УсеЛКСМ „Хлебную эстафэту“ організацыю чырвоных хлебных абозаў і давядзеньне хлебнай эстафэты да вёсак і колгасаў. Хлебазагатоўкі павінны ўзмацняць ленінскую змычку між горадам і вёскай, разгарнуць новую форму шэфства горада над вёскай—вытворчае шэфства, раставіць дазорныя пасты „лёгкай кавалерыі“ па ўсім шляху сьледваньня соцыялістычнага колгаснага ўраджаю савецкай краіны ў элеватары і ў рабочыя цэнтры.

Комсамол павінен устанавіць пільны нагляд за тым, як вырушаюцца вагоны, ці сваячасова адпраўляюцца таварныя саставы к ссыпным пунктам, як ідзе збор мяхоў і брэзэнтаў ці няма шкоднікаў, якія дапамагаюць кулацтву зрываць хлебазагатоўкі.

Хлебазагатоўкі—адзін з вучасткаў баявога фронту соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. У сваёй барацьбе за соцыялістычную вёску ленінскі комсамол павінен так раставіць сілы, каб ніводзін з вучасткаў гэтага фронту (барацьба за сілос, узмацненьне і колектывізацыя жывёлагадоўлі, выкананьне ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі) не выпадаў з агульнага ланцугу нашых гаспадарча-палітычных задач на вёсцы.

Вырашаючы гэтыя задачы з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю і організаванасьцю, комсамол мобілізуе свае сілы на „важнейшы вучастак фронту — на хлебазагатоўкі.

Усім выканаўчым камітэтам і саветам БССР

Аб садзейнічаньні хлебанарыхтоўчай кампаніі

Пачатая хлебанарыхтоўчая кампанія мае вялізарнае эканамічнае і палітычнае значэньне. Ад пасьпяховага выкананьня хлебанарыхтоўчага пляну залежыць нормальнае забясьпечаньне працоўных гораду і вясковай беднаты хлебам, залежыць пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Гэта кампанія павінна яшчэ больш узмацніць сувязь рабочае клясы і бядняцка-серадняцкай масы вёскі і забясьпечыць далейшае выкарчоўваньне капіталістычных элемэнтаў.

Плян хлебанарыхтовак для БССР у колькасьці 123000 тон зьяўляецца ўпаўне рэальным і поўнае яго выкананьне залежыць выключна ад таго, як будзе праяўляцца актыўнасьць масовых органаў з самага пачатку кампаніі, ад таго, якія будуць узяты тэмпы ў нарыхтоўках, і ад таго, як будуць уцягнуты колгасьнікі, батракі і бядняцка-серадняцкія масы вёскі ў гэту работу.

Улічваючы вышэйна значанае і тое, што хлебанарыхтоўчая кампанія будзе праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы і супраціўленьня кулацтва, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе ўсім выканаўчым камітэтам і саветам:

1. З самага пачатку кампаніі ўсю работу праводзіць пры шчыльным удзеле савецкай грамадзкасьці, сельгасрабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

2. Безадкладна праверыць ці даведзены пляны хлебанарыхтовак да кожнага сяла і кулацкага двара, разгарнуць кампанію па абгаварэньні гэтых плянаў на грамадзкіх сходах вёскі і сходах беднаты, наладзіўшы растлумачальную працу сярод колгасьнікаў, беднаты і сераднякоў для таго, каб кожны паасобны двор актыўна ўдзельнічаў у выкананьні плянаў нарыхтовак, не дапушчаючы пры гэтым ніякага адміністраваньня ў адносінах бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

3. Безадкладна разгарнуць працу пры ўдзеле беднаты і сераднякоў у напрамку выяўленьня кулацкіх гаспадарак, прад'яўляючы апошнім цьвёрдыя заданьні на здачу хлеба.

4. Забясьпечыць шырокае разгортваньне чырвоных абозаў для сапраўднага выкананьня плянаў на базе спаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі, сельсаветамі, колгасамі, пасёлішчамі і паасобнымі гаспадаркамі.

5. З самага пачатку кампаніі павесьці рашучую барацьбу са шкодніцтвам, з кулакамі і нэпманамі, перашкаджаючымі хлебанарыхтоўчай кампаніі, уцягваючы ў гэту барацьбу батрацтва і бядняцка-серадняцкія масы вёскі.

6. Узяць пад асобны кантроль працу ўсіх нарыхтоўчых організацый і строга сачыць за іх дзейнасьцю пры правядзеньні хлебанарыхтоўчай кампаніі.

7. Прадаставіць складачныя памяшканьні, неабходныя для ссыпкі нарыхтаванага збожжа і сыравіны.

Райвыканкомы і сельсаветы павінны стаць сапраўды на чале хлебанарыхтоўчай кампаніі забясьпечыўшы клясавае яе правядзеньне, памятуючы, што ўся адказнасьць за правядзеньне хлебанарыхтовак ускладаецца на кожны выканаўчы камітэт і савет у паасобку.

Вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Хацкевіч

За Сэкратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Сташэўскі.

21 жніўня 1930 г.
г. Менск.

„Мы дзе-небудзь у кучу ссыпем“

На Вобальшчыне падрыхтоўка да хлебазагатовак зусім не распачата. Не праведзена ніякай масавай працы, пляны загатовак не даведзены да вёсак і колгасаў, не папулярызаваны сярод іх.

Вобальскае спажывецкае таварыства, якое павінна праводзіць загатоўкі, не адрамантавала хлебных складаў, а новыя склады будуе марудна і зараз зусім спыніць працу з-за адсутнасьці дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў, у прыватнасьці цьвікоў. Кіраўнікі таварыства не жадаюць замяніць дэфіцытныя будаўнічыя матарыялы мясцовымі.

Такім чынам, да хлебазагатоўчай кампаніі працаўнікі Вобальскага таварыства не падрыхтаваны.

— Як вы будзеце загатаўляць хлеб, калі няма складаў?—запыталіся „лёгкія кавалерысты“..

— Ды „мы дзе-небудзь ссыпем у кучу“.

На гэтыя факты мясцовыя партыйныя, комсамольскія і савецкія органы не рэагуюць.

Органам РСІ неабходна зацікавіцца справай падрыхтоўкі ў Вобальскім спажывецкім таварыстве.

Група „Лёгкай Кавалерыі“.

Абгаварылі і... паставілі кропку

Комсамольская ячэйка пры Акргандлі па пытаньню аб хлебанарыхтоўках бязьдзейнічае. Формальна справу абгаварылі, вынесьлі рэзолюцыю, выклікалі на соцспаборніцтва іншую ячэйку і на гэтым паставілі кропку. Бюро ячэйкі, каб зьняць з сябе ўсялякую адказнасьць за хлебанарыхтоўкі, усю працу зваліла на „Лёгкую кавалерыю“.

Сасом.

Усё яшчэ ня вылезьлі з габінэтаў

Партыйна-комсамольскія ячэйкі Пухавіцкага раёну не праводзяць ніякай працы па падрыхтоўцы да правядзеньня хлебазагатоўчай кампаніі.

Райком партыі і райвыканком ня прынялі захадаў да шырокай папулярызацыі сярод насельніцтва плянаў загатоўчай кампаніі г. г.

Культустановы і культсілы вёскі не мобілізаваны для правядзеньня масавай працы сярод колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Нічога ня зроблена па падрыхтоўцы да хлебазагатоўчай кампаніі і па лініі коопэрацыйных організацый.

Вішня.

Яны плянуюць...



„А між тым“...

Упартасьць настаўніка Анановіча

Дудзіцкая комсамольская ячэйка, Самахвалавіцкага раёну, распачала падрыхтоўчую працу да хлебазагатоўчай кампаніі. На сходзе ячэйкі былі прапрацаваны задачы ўдзелу комсамольцаў у асеньніх загатоўках і намечаны конкрэтныя мерапрыемствы.

Аднак увага грамадзкасьці вакол падрыхтоўкі да хлебазагатоўчай кампаніі яшчэ не мобілізавана.

Бывае, што замест дапамогі— зрываюць падрыхтоўчую працу.

Так, загадчык сямігадовай школы Анановіч, заняў сьвіран пад канюшыну для сваёй каровы адмовіўся аддаць яго спажывецкай коопэрацыі пад ссыпны пункт. Прапанову сельсавету аслабаніць гэты сьвіран, а канюшыну перанесьці у другі, Анановіч адмовіўся выганаць.

Трэба, каб адпаведныя органы ўзьдзейнічалі на загадчыка Дудзіцкай школы, які сваёй упартасьцю перашкаджае падрыхтоўцы памяшканьня для збожжа.

Чабары.

Кастрычнікавае РБ ЮП
ПАВЕДАМЛЯЕ,
што да 26-VIII—30 году
ПРАВОДЗІЦЦА РЭГІСТРАЦЫЯ КОМСАМОЛЬЦАЎ,
якія жадаюць у гэтым годзе працаваць павадырамі фарпасных школ.
Старшыня КРБ ДКА Грабар

Паведамленьне

Сёньня а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ адбудзецца агульны сход цэх. парт. ячэйкі рэдакцый газэт „Чырвоная Зьмена“, „Беларуская Вёска“ сумесна з ячэйкай ЛКСМБ рэдакцый газэт.

На абвестцы дню:

1. Вынікі XVI зьезду ЎсеКП(б) (Шмідт).
2. Выбары дэлегатаў на Ўнечарговую райпартконфэрэнцыю.
3. Прыём у партыю.
4. Рознае.

Прысутнічаньне сяброў і кандыдатаў партыі і комсамольцаў абавязкова. Запрашаюцца беспартыйныя.

Бюро цэх. яч. КП(б)Б і Бюро яч. ЛКСМ.

Сход рабкораў Фрунзаўскага раёну

Фрунзаўскі РК КП(б)Б сумесна з рэдакцыяй газ. „Зьвязда“ склікаюць у аўторак, 26 жніўня, а 7 гадз. вечары у памяшканьні рэдакцыі газ. „Зьвязда“

Сход рабкораў Фрунзаўскага раёну

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Аб месячніку беларусізацыі
2. Аб міжнароднай сувязі.

На сход павінны зьявіцца ўсе члены рэдколегій, шматтыражных насьценных газэт, рабкоры, вайскоры, юнкоры Фрунзаўскага р-ну. Яўка ўсіх апоргаў парт-ячэйкі Фрунзаўскага раёну абавязкова.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б.
Сэктар масав. сэктару рэд. газ. „Зьвязда“.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 590